DOI:10.17951/sb.2025.19.227-245
Studia Białorutenistyczne 19/2025 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Nadzeya Kakhnovich

University of Warsaw (Poland)
e-mail: n.kakhnovich@uw.edu.pl
https://orcid.org/0009-0006-4832-1956

# Старабеларуская *цнота* на фоне польскай мовы XVI–XVII стст.

*Old Belarusian Concept cnota on the Background of Polish Language of the 16th–17th Centuries*

*Starobiałoruska cnota na tle języka polskiego XVI–XVII wieku*

**Abstract**

The article analyses the Old Belarusian concept *цнота* ('virtue') in comparison with the Polish *cnota* of the 16th century. The aim of the study is to identify the specific features of understanding this value in the Old Belarusian cultural tradition and to determine to what extent it corresponds to the characteristics of the Polish concept. The research is based on the theoretical principles of the Lublin School of Cognitive Ethnolinguistics, particularly the method of cognitive definition. The material includes 147 contexts of the lexeme *цнота* found in Old Belarusian texts from the 16th–17th centuries, as well as data from historical dictionaries of the Belarusian language. The results show that *цнота* was perceived in the Old Belarusian as a divinely inspired moral quality associated with faith, wisdom, humility, and good deeds – an ideal requiring effort and serving as an example to others. The reconstructed value profile is largely typical of medieval Europe and closely resembles the representation of the Polish lexeme *cnota* in the texts of the same period. However, the Polish term is characterised by much higher frequency, a greater degree of conceptualisation, and semantic differentiation. Unlike its Polish counterpart, the Old Belarusian *цнота* almost never expresses the meaning of 'female sexual purity', which probably became established later.

**Keywords**: Old Belarusian language, Polish language, value names, virtue

**Abstrakt**

W artykule analizowany jest starobiałoruski koncept *цнота* w porównaniu z polskim *cnota* z XVI wieku. Celem badania jest ukazanie specyfiki rozumienia tej wartości w starobiałoruskiej

tradycji kulturowej oraz określenie, w jakim stopniu jest ona tożsama z polskim pojęciem. Podstawę teoretyczną stanowią założenia Lubelskiej szkoły etnolingwistyki kognitywnej, w szczególności metoda definicji kognitywnej. Materiał badawczy obejmuje 147 kontekstów użycia leksemu *цнота* w starobiałoruskich tekstach z XVI–XVII wieku oraz dane historycznych słowników języka białoruskiego. Wyniki pokazują, że *цнота* w języku starobiałoruskim była pojmowana jako moralna jakość boskiego pochodzenia, związana z wiarą, mądrością, pokorą i dobrymi uczynkami, wymagająca wysiłku i stanowiąca przykład dla innych. Obraz tej wartości jest zasadniczo typowy dla średniowiecznej Europy i bliski reprezentacji polskiego leksemu *cnota* w tekstach z tego samego okresu. Polski wyraz charakteryzuje się jednak znacznie wyższą frekwencją, większym stopniem konceptualizacji i zróżnicowaniem semantycznym. W przeciwieństwie do polskiego *cnota*, starobiałoruska *цнота* prawie nie realizuje znaczenia ‘kobiecej czystości seksualnej’, które prawdopodobnie utrwaliło się dopiero w późniejszym okresie.

**Słowa kluczowe**: język starobiałoruski, język polski, nazwy wartości, cnota

**Анатацыя**

У артыкуле аналізуецца старабеларускі канцэпт *цнота* ў параўнанні з польскім *cnota* XVI ст. Мэта даследавання — выявіць асаблівасці разумення гэтай каштоўнасці ў старабеларускай культурнай традыцыі і вызначыць, наколькі яно супадае з характарыстыкамі польскага паняцця. Тэарэтычнай асновай даследавання сталі прынцыпы Люблінскай школы кагнітыўнай этналінгвістыкі, у прыватнасці метад кагнітыўнай дэфініцыі. Матэрыялам паслужылі 147 кантэкстаў ужывання лексемы *цнота* ў старабеларускіх тэкстах XVI–XVII стст. і даныя гістарычных слоўнікаў беларускай мовы. Вынікі паказалі, што *цнота* ўспрымалася як боскага паходжання маральная якасць, звязаная з верай, мудрасцю, пакорай і добрымі ўчынкамі, якая патрабуе намагання і служыць прыкладам для іншых. Вобраз каштоўнасці ў цэлым тыповы для еўрапейскага Сярэднявечча і максімальна набліжаны да рэпрэзентацыі польскай лексемы *cnota* ў тэкстах адпаведнага перыяду. Пры гэтым апошняя адзначаецца істотна вышэйшай частотнасцю, большай ступенню канцэптуалізацыі і дыферэнцыяванасці. У адрозненні ад польскага слова, старабеларуская *цнота* амаль не рэалізуе значэння ‘жаночая сэксуальная чысціня’; за гэтым словам яно, хутчэй за ўсё, замацуецца ў больш позні перыяд.

**Ключавыя словы**: старабеларуская мова, польская мова, назвы каштоўнасцей, цнота

Слова *цнота* (анг. *virtue*, фр. *vertu*, ням. *Tugend*, рус. *добродетель*) у сучаснай беларускай мове мае два асноўныя значэнні: 1.‘маральная чысціня; строгасць у маральных адносінах’ (TSBM); ‘чысціня маральных адносін’ (TSBLM) і 2.‘дзявочая нявіннасць’ (TSBLM, TSBM). Артыкул *цнота* знойдзем у слоўніку іншамоўных слоў, з пазнакай *польск*. і дэфініцыяй ‘маральная чысціня; сціпласць у маральных адносінах’ (Bułyka, 2005). Паводле Аляксандра Булыкі, слова *цнота* трапляе з польскай у старабеларускую (мы выкарыстоўваем гэты

тэрмін выключна для адлюстравання пераемнасці; альтэрнатыўныя назвы: руская мова Вялікага княства Літоўскага, усходнеславянская мова ВКЛ, староукраінская мова, *простая мова* і інш.) у канцы XV ст.; запазычанымі з польскай з'яўляюцца таксама аднакаранёвыя *цный*, *зацный*, *безецный* (Bułyka, 1980, s. 133–134).

Паміж даследчыкамі пануе згода адносна этымалогіі лексемы. Яшчэ Аляксандар Брукнэр звязваў назоўнік *cnota* (а таксама аднакаранёвыя *zacny*, *bezecny*, *bezeceństwo*, *cnotliwy*) з прыметнікам *cny*, якія ўзводзіў да форм *czstny, *czstnota, а іх, у сваю чаргу, да праславянскіх *czĭstĭn- і *czĭst' 'cześć' (SEBr, s. 66). Слоўнікі Францішка Слаўскага і Веслава Борыся таксама сведчаць пра тое, што *cnota* – абстрактны назоўнік ад *cny*, і звязваюць абедзве лексемы з прасл. *čьstьnъ, *čьstь (SEBor, s. 86–87; SESł, I, s. 107). У *Праславянскім слоўніку* рэканструюецца яшчэ старажытнейшая форма *čьt-tь (ад дзеяслова *čisti, што, магчыма, узыходзіць да іе. k*i-t-ti-, якому адпавядаюць стараіндыйскі і авестыйскі дзеясловы з семантыкай 'мысліць, разумець') (SPsł, 2, s. 316–317).

Сувязь паміж паняццямі *cześć* і *cnota* некаторы час была дастаткова адчувальнай, напр., значэнні лексемы *cnota* ў *Старапольскім слоўніку*: 1. 'zacność, cnotliwość, morum honestas', 2. 'jakaś zaleta etyczna, variae virtutes', 3. 'moc, virtus, potestas', 4. 'cześć, honor' (SStp, 1, s. 315–316). Але ўжо *Слоўнік польскай мовы XVI ст.* у артыкуле CNOTA падае асноўнае значэнне 'zacność, prawość, szlachetność, dodatnie cechy moralne' і ў якасці варыянтаў асноўнага значэння згадвае: a. 'cnoty chrześcijańskie', b. 'przymioty przypisywane Bogu', c. 'talent, zdolności artystyczne, wiedza', d. 'niewinność, czystość' (SPXVI, 3, s. 537–545) – сярод іх найбольш ужывальнымі будуць a і d. (SPXVI, 3, s. 537–545).

Хутчэй за ўсё, у старабеларускую мову лексема *cnota* запазычваецца ў гэтым сваім значэнні: 'станоўчыя маральныя якасці, шляхетнасць, правільнасць'. Аўтары *Гістарычнага слоўніка беларускай мовы* перакладаюць адпаведную адзінку сучасным 'цнота' (HSBM, 36, s. 245). У дадзеным артыкуле мы хацелі б разабрацца ў асаблівасцях старабеларускага канцэпту і адказаць на пытанне, ці адрознівалася ўжыванне лексемы *цнота* ад ужывання польскага слова *cnota* адпаведнага перыяду.

У дадзеным артыкуле мы абапіраемся на тэарэтычныя і метадалагічныя прынцыпы Люблінскай школы кагнітыўнай этналінгвістыкі (Niebrzegowska-Bartmińska, 2020). Мы прымаем, што ў мове захоўваецца пэўная інтэрпрэтацыя рэчаіснасці, сукупнасць суджэнняў аб якой складае моўную карціну свету (Bartmiński, 1990, s. 110). Асноўнымі адзінкамі моўнай карціны свету з'яўляюцца моўныя канцэпты (стэрэатыпы), якія ўяўляюць сабой калектыўнае ўспрыманне людзей, рэчаў і здарэнняў (Bartmiński, 2006, s. 20) і, як правіла, рэпрэзентуюцца той ці іншай лексемай (Gryshkova, 2014, s. 45). Эфектыўным спосабам апісання моўных канцэптаў з'яўляецца кагнітыўная дэфініцыя, якая прадугледжвае максімальна поўную рэканструкцыю характарыстык даследаванага прадмета, замацаваных у моўнай сістэме супольнасці, на аснове даных рознага тыпу

(як правіла, слоўнікаў, анкет і тэкстаў розных жанраў) (Bartmiński, 1988). Апісанне семантычных залежнасцяў і, затым, сінтэтычная дэфініцыя лексемы прадстаўляюцца структурна ў адпаведнасці з семантычнымі блокамі (фасетамі), да якіх належаць:

– універсальныя семантычныя катэгорыі (напр., сінанімія, гіпер- і гіпанімія);

– катэгорыі, уведзеныя ў актыўны ўжытак люблінскімі навукоўцамі з часоў стварэння *Слоўніка народных стэрэатыпаў і сімвалаў* (напр., калекцыі: „з якімі іншымі прадметамі прадмет апісання выступае разам у адным месцы і часе на падставе выканання нейкай агульнай функцыі" (SSSL, 1996, s. 16, пераклад наш – Н.К.),

– катэгорыі, якія вылучаюцца даследчыкам у адпаведнасці са спецыфікай той ці іншай лексічнай групы (напр., для назваў каштоўнасцяў актуальнымі могуць быць такія фасеты, як суб'ект каштоўнасці, спосабы яе праяўлення і г.д.) (напр., гл. Grzeszczak, 2017, s. 125–133).

Назвы каштоўнасцей складаюць асноўны прадмет даследаванняў люблінскай этналінгвістыкі апошніх дзесяцігоддзяў, пра гэта сведчыць, напрыклад, дыскусійны праект EUROJOS і распрацаваны ім *Аксіялагічны лексікон славян і іх суседзяў* (LASiS). Уяўляецца, што выпрацаваны ў межах праекта падыход да даследавання назваў каштоўнасцей у сучасных мовах можа быць паспяхова выкарыстаны і для апісання канцэптаў аддаленых у часе культур (напр, гл. Korus, 2017, s. 47–48). Асноўныя мадыфікацыі ў метадалогіі мусілі б тычыцца матэрыялу: немагчыма правядзенне анкетавання; абмежавана колькасць слоўнікаў; у выбары тэкстаў належыць арыентавацца не толькі на стандартныя і клішаваныя, але і на мастацкія, аўтарскія – тым больш, што колькасць старабеларускіх помнікаў вельмі невялікая ў цэлым. Па гэтай жа прычыне належыць браць пад увагу не толькі непасрэдную назву каштоўнасці, але і вытворныя ад яе (напр., прыметнік *цнотливый*).

Апроч згаданага раней *Гістарычнага слоўніка беларускай мовы*, даступным тыпам даных даследаванага перыяду з'яўляюцца непасрэдна тэксты розных жанраў, створаныя ў ВКЛ. У Картатэцы *Гістарычнага слоўніка беларускай мовы* (Kartatèka) знаходзім 146 кантэкстаў ужывання лексемы *цнота*, што мусіць сведчыць пра дастатковую значнасць паняцця ў тагачаснай культуры (для параўнання: *честь* – больш за 430 кантэкстаў, *учтивость* – 116, *почтивость* – 106, *повага* – 75). Мы дапоўнілі гэты матэрыял яшчэ адным прыкладам, знойдзеным намі ў *Лексісе* Лаўрэнція Зізанія (Kartatèka, Зіз., 1596), такім чынам, асноўны корпус даследаванага матэрыялу складае 147 кантэкстаў ужывання лексемы *цнота*. Па меры неабходнасці мы будзем дапаўняць яго прыкладамі словаўжывання дэрыватаў лексемы (іх лексічнае акружэнне шмат у чым падобнае да лексічнага акружэння іх дэрывацыйнай базы, хоць яго падрабязны агляд патрабаваў бы асобнага артыкула).

Табліца 1. Размеркаванне кантэкстаў ужывання лексемы *цнота* паводле крыніц.

| № | Рэлігійная літаратура | | | Свецкая літаратура | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Крыніцы | Кольк. кант. | Даты | Крыніцы | Кольк. кант. | Даты |
| 1 | Апакр. | 1 | 1598 | АВК | 3 | 1577<br>1629<br>1663 |
| 2 | Бер.саб. | 3 | 1597 | АЗР | 1 | 1507 |
| 3 | Біблія | 4 | пач. XVII ст. | Алекс. | 3 | пач. XVII ст. |
| 4 | Валх. | 4 | к. XV ст. | Арх.зб. | 1 | 1601 |
| 5 | Варл. | 22 | 1637 | Атыла | 1 | 1580 |
| 6 | Выкл. | 1 | сяр. XVII ст. | Бельск. | 2 | пач. XVII ст. |
| 7 | Дыяр. | 3 | 1638–1648 | Бых. | 1 | к.XVI – пач.XVII ст. |
| 8 | Ев. Кал. | 13 | 1616 | Бяр. | 3 | 1653 |
| 9 | Жыц. св. | 1 | сяр. XVII ст. | ГЮМ | 1 | 1626 |
| 10 | Зб. 107 | 4 | сяр. XVII ст. | Еўл. | 1 | пач. XVII ст. |
| 11 | Зб. 255 | 3 | сяр. XVII ст. | Зіз. | 1 | 1596 |
| 12 | Зб. 259 | 2 | сяр. XVII ст. | КВС | 1 | 1552 |
| 13 | Зб. 261 | 13 | пач. XVII ст. | КПД | 1 | 1551 |
| 14 | Зб. 752 | 2 | 2 пал. XVII ст. | Рач. | 2 | ~1580 |
| 15 | Зб. вып. | 1 | 1722 | Ст. 1588 | 2 | 1588 |
| 16 | Лям. | 1 | 1620 | Стрыйк. | 3 | пач. XVII ст. |
| 17 | Мак. | 1 | пач. XVII ст. | Троя | 1 | пач. XVI ст. |
| 18 | Наб. тур. | 1 | к. XVI ст. | Хран. | 1 | XVII ст. |
| 19 | Пыт. | 1 | 1603 | Хр. польск. | 2 | пач. XVII ст. |
| 20 | Скар., Руф | 1 | XVI ст. | | | |
| 21 | Скар., Ж. | 1 | XVI ст. | | | |
| 22 | Скар., П.б. | 1 | XVI ст. | | | |
| 23 | Сматр., Каз. | 31 | 1620 | | | |
| 24 | Ст. бр. | 1 | 1651 | | | |
| | Разам: | 116 | | Разам: | 31 | |

Як можна ўбачыць у Табл. 1, храналагічна ніжэйшая мяжа ўжывання слова *цнота* ў старабеларускай мове сапраўды прыпадае на канец XV ст., а менавіта на апакрыфічную *Аповесць аб трох каралях-валхвах*, перакладзеную ў сярэднявеччы на шматлікія мовы з лацінскай (Chaustowicz, 2024, s. 379). Калі казаць пра верхнюю мяжу, толькі адно словаўжыванне зарэгістравана для XVIII ст., гаворка пра *Збор выпадкаў кароткі і духоўным асобам патрэбны*, выдадзены ў Супраслі ў 1722 г. Даты асноўнага корпуса супадаюць з перыядам росквіту старабеларускай пісьменнасці ў XVI – першай палове XVII ст.

У абсалютных лічбах колькасць кантэкстаў у рэлігійнай літаратуры амаль у 4 разы большая, чым у свецкай. Аднак мы можам адзначыць, што вялікая частка словаўжыванняў прыпадае на адны і тыя ж крыніцы. А калі мы возьмем пад увагу колькасць крыніц, у якіх лексема выступае, то прапорцыя 24 да 19 на карысць рэлігійных тэкстаў дазваляе казаць пра *цноту* не толькі як пра багаслоўскі тэрмін, але і як пра паўнавартасную адзінку агульнай мовы.

Заканамерна лексема *цнота* найбольш распаўсюджана ў творах дыдактычнага зместу (жыціі, павучанні, прадмоўі і пасляслоўі да Біблії). Дастаткова часта сустракаецца яна ў палемічнай літаратуры, якой таксама ўласціва павышаная рэфлексія над пытаннямі маралі (у т.л. *Казанні на чэснае пахаванне Лявонція Карповіча* Мялеція Сматрыцкага, *Апісанні і абароне сабору Берасцейскага* Пятра Скаргі і інш.). Тэрмін актыўна выкарыстоўваўся ў дзелавым пісьменстве (Статут ВКЛ 1588 і інш.). Знаходзім яго ў летапісах і хроніках (у т.л. Мацея Стрыйкоўскага, Марціна Бельскага). Урэшце, сустракаем яго і ў мастацкай літаратуры, часцей за ўсё перакладной (*Александрыя*, *Аповесць аб Трої* і г.д.) Усё гэта сведчыць аб актуальнасці даследаванага канцэпту як для старабеларускай культуры, так і для эпохі ў цэлым.

**Дэрываты**. Паводле *Гістарычнага слоўніка беларускай мовы*, дэрыватамі ад назоўніка *цнота* з'яўляюцца прыметнік *цнотливый*, прыслоўе *цнотливе,* назоўнік *цнотливець*, а таксама амаль сіметрычны шэраг для называння адмоўных якасцей: *нецнота*, *нецнотливый*, *нецнотливе*, *нецнотливость* (HSBM 36, s. 243–245; HSBM 20, s. 366–377). Цікава, што слова *нецнота* апроч асноўнага значэння 'невысакароднасць, мярзота', якое можа быць антонімам для *цноты*, мела другое значэнне 'нягоднік' і магло называць асобу: его милость... потварцою и нецнотою мене звалъ (Kartatèka, АВК, XXII, 162, 1555–1565); Неблагоразꙋмный: Нецнота, нечинѧчій досит<sup>ѕ</sup> своей повинности, злосник, невдѧчный (Kartatèka, Бяр., 90). У сучаснай літаратурнай беларускай мове згаданае слова разам з вытворнымі не захавалася, аднак у дыялектах знаходзім *няцноцце* з падобным ацэначным значэннем (напр., у папроку маці да сына: "Ай-ай-ай, якое ты няцноцце!")[1].

**Гіперонімы і гіпонімы**. У наяўным матэрыяле літаральна два назоўнікі, якія можна лічыць гіперонімамі лексемы *цнота – речъ* і *примѣта*: показꙋетъ теды значне Хс҃ Гд҃ь приповѣстью сею, ижъ справедливость и вшелѧкаѧ цнота сама въ собѣ естъ речъ и добраѧ и славнаѧ, и людій тыхъ которыи сѧ въ ней кохаютъ, близко Бг҃а поставлѧетъ... (Kartatèka, Ев. Кал., I, 3б); вси тыи выщ҃ гѵороглѵфице описаныи примѣты, а рачей цноты, въ собѣ оказалесь и оказꙋешъ мꙋжествен҃не (Kartatèka, Мак.; прадм.; л. 5б).

Што тычыцца гіпонімаў, маем словазлучэнні, утвораныя па адной мадэлі і характэрныя таксама для іншых еўрапейскіх моў, такія як цнота чс҃тости,

[1] Зафіксавана аўтарам у гаворках вёскі Чарневічы (Глыбоцкі р-н, Віцебская вобл.) ад інфарманта 1953 г. нар.

цнота те*р*пѣнїю (Жыц. св., 1б), цнот(а) ѩлъмѹжны (Kartatèka, Ст. бр., 6), ёсць згадкі пра млс̑ть, покорѹ (Kartatèka, Зб. 261, 100б), цноту справедливости (Kartatèka, Арх. зб., II, 19, 1601). У *Дыярыушы* Афанасія Філіповіча знойдзем старабеларускі пераклад кардынальных цнот: цноты головныи чтыри тыи сут ростропно*ст*, мѣрность, справедливо*ст* и мѹжество (Kartatèka, Дыярыуш, 173б). Як адна з цнот магла трактавацца вера: и в$^{s}$ вѣрѣ до Б͠га, и в$^{s}$ иншихъ цнотах велце знаменитого (Kartatèka, Варл. 136). У Мацея Стрыйкоўскага знаходзім выражэнні вѣри цноты / побожности цноты, а ў *Казанні* Мялеція Сматрыцкага згадваюцца яшчэ і “свецкія” цноты: хоть посполитымъ цнотамъ в немъ присмотрѣвалъсѧ, про*д*кѹючимъ его в нихъ пере*д* всѣми и напобожнѣйшими знайдовалъ (Kartatèka, Сматр., Каз., 37).

**Сінонімы**. Амаль няма прыкладаў кантэкстуальных сінонімаў слова *цнота*. На нашу думку, у адзінкавым выпадку можна казаць пра *чистость*: то пошло з чистости сер*д*ъца нашего, або з цноты (Kartatèka, Алекс. 16).

Аднак лексема *цнота* ўжываецца ў складзе некалькіх артыкулаў першых старабеларускіх слоўнікаў. *Лексіс* Лаўрэнція Зізанія дае слова *цнота* ў якасці дэфініцыі да царкоўнаславянскага добродѣтел̑ (Kartatèka, Зіз., 1596). І ў *Лексіконе* Памвы Бярынды знаходзім: Добродѣтел̑: цнота, так̑же моц̑ (Kartatèka, Бяр., 34), а таксама: Свѧтба: Цнота, свѧтобливо*ст*, доброть, слюбъ иноческїй (Kartatèka, Бяр. 145). У апошняй частцы *Лексікона* даецца каментар для імені *Сава*: Ровнина, а*б* побо*ж*ност$^{s}$, цнота, а*б̑* покладаючї... (Kartatèka, Бяр. 306). Такім чынам, да патэнцыйных сінонімаў аднясем *свѧтобливость*, *доброть*, *побожность*. Безумоўна, іх магло быць больш, што пацвярджаецца данымі першых беларускіх слоўнікаў для лексемы *цнотливый*: Бл͠гъ: добрый, цнотливый, мужный (Kartatèka, Бяр. 3), Добродѣѧнїе: цнотливыи справы (Kartatèka, Зіз. 26, таксама Бяр. 34), Исправленїе: ...справа, справленье, зрѧжѣнье, цнотливый а правооучиненый оучинокъ (Kartatèka, Бяр. 60), Добродѣтелный: цнотливый (Kartatèka, Зіз. 30), Добродѣтелный: цнотливый: цный, албо добрый, оучтивый: почесный, пенькный, вдѧчный, оужитечный, албо ѩсный. Метаф: Зацный, славный, знаменитый, а*л̑*бо панскїй, непосполитый (Kartatèka, Бяр. 34).

Цікава, што слова *цнота* не падаецца ў якасці азначэння да такіх царкоўнаславянскіх лексем, як цѣломѹдрїе або честность: у прыватнасці, жаночая сэксуальная нявіннасць у даследаваны перыяд гэтым словам актыўна не называлася, што пацвердзіцца таксама аналізам іншых крыніц. А вось сувязь паняццяў цноты і моцы, заўважная ў *Лексіконе* Бярынды, уяўляецца рэхам больш старажытнай семантычнай залежнасці.

**Калекцыі**. Дастаткова яснае ўяўленне аб сувязі цноты з іншымі каштоўнасцямі тагачаснай беларускай культуры можна атрымаць, даследуючы устойлівыя спалучэнні слоў са злучальнай сувяззю, або калекцыі. Найчасцей калекцыю з лексемай *цнота* ўтварае *вера* – як мінімум, у 9 кантэкстах, напр.: дознавши мно*г* кро*т* вѣри цноты (Kartatèka, Стрыйк. 628); ведля веры и цноты

(Kartatèka, КПД, 207, 1551); въ вѣрѣ до Бг҃а, и въ иншихъ цнотах (Kartatèka, Варл., 136).

Уяўляецца, што тлумачэннем лацінскіх калек *sub fide et honore, sub honore et conscientia* з'яўляюцца формулы ў наступных цытатах: а ведже и врядники ведля веры и цноты своее мають то правдиве... поведети... (Kartatèka, КПД, 207, 1551); намнѣйшей шафунокъ того податку нигдѣ индей ся не чинилъ, одно на властную потребу и оборону... под верою и цнотою своею (Kartatèka, АВК, III, 276, 1577 Брест). Такім чынам, сувязь цноты з паняццем гонару (*честь, почтивость*) магла захоўвацца.

Вяртаючыся да калекцый з іншымі назвамі каштоўнасцей, заканамерна сустракаем апроч веры *побожность* (Kartatèka, Лям. 4; Kartatèka, Сматр., Каз. 6; Kartatèka, Рач. 280, 346) і *набоженъства* (Kartatèka, Зб., 261, 157). У перакладзе *Евангелля вучыцельнага* Каліста на старабеларускую мову 1616 г. у некалькіх фрагментах знойдзем калекцыі з выразам *добрые справы* – адлюстраванне найстаражытнейшых уяўленняў пра тое, што цнота неразрыўна звязана са справамі і ўчынкамі асобы (Buczyńska-Garewicz, 1981, s. 12), напр.: Пыха вшелѧкое цнѡтъ богатство и справы добрыи роспорошѵетъ, внѣвечъ оборочаетъ и затрачаетъ (Kartatèka, Ев. Кал., I, 2б). Сюды ж можна аднесці *доброе захованье* (Kartatèka, Бых. лет. ПСРЛ, 490; Kartatèka, Ст. 1588. 134 в-с), а таксама адзінкавыя цнотъ и добрыхъ обычаевъ (Kartatèka, Скар., Ж, 4б), наѵки цнот и дѣлностей рицерских (Kartatèka, Стрыйк. 435).

Тры разы сустракаем спалучэнне *цнота и мудрость* (Kartatèka, Бібл. 83; Kartatèka, Бельск. 24б; Kartatèka, Выкл. 3б); сюды ж трэба аднесці выражэнне: мѵдрый и розсѵдный, и во всѣхъ цнотахъ значный (Kartatèka, Варл. 29б). У перакладной *Аповесці аб трох каралях-валхвах* двойчы сустракаецца *цноты и дивы* (Kartatèka, Валх. XV в. 38 об.). Сярод адзінкавых, але характэрных трэба згадаць такія назвы каштоўнасцей, як *дары духа светого* (Kartatèka, Зб. 255, 12), *терпливости* (Kartatèka, Пыт., 31–32), *отплата* (Kartatèka, Бер. саб. л. 10 об.), *справедливость* (Kartatèka, Ев. Кал., I, 3б) *чыстость* (Kartatèka, Атыла, 211), а таксама спалучэнні з некалькіх элементаў: цнотъ и покоры и доброть слава (Kartatèka, Валх. 5б); въ покаѧнїи и слезахъ и во вшелѧкихъ цнотахъ (Kartatèka, Варл., 320); згаданыя вышэй офѣры и добрыи справы и цнѡты (Ев. Кал., I, 7б); веру, цноту и охоту (Kartatèka, АВК, I, 178, 1629, Гродна); вѣри, цноты, статечности и тои ѡхоты вашои противко мене (Kartatèka, Хр. польск. 22).

Заўважым, што калекцыі з дэрыватам *цнотливый* у асноўным адпавядаюць іерархіі каштоўнасцеў, якая вымалявалася вышэй: напр., тогды маем мы гс҃дръ,... ѡпекуна чоловека доброго ростропного цнотливого побожного... на таковые имен҃ѧ ѵстановити (Kartatèka, Ст. 1588, 82.c); пры гэтым звяртае ўвагу выключна частае выкарыстанне ў лексічным акружэнні прыметніка *цнотливый* лексемы *добрый* (Kartatèka, Зб. 259, 273; Kartatèka, Бібл. 594; Kartatèka, Хран., 2405, л. 387б; Kartatèka, Арх. ЮЗР., ч. VIII, т. 4, 30, 1555; Kartatèka, Ст. 1588, 126, н-с і інш.).

**Антонімы**. Адным з антонімаў да слова *цнота* з’яўляецца *нецнота*: неровност ест пыха, ровност покора, покора ест жродлом цноты, пыха жродлом нецноты: нецнота в люциперꙋ, цнота в бг҃ꙋ правдивом (Kartatèka, Дыярыуш, 173б–174); а предсѧ похлѣбцы дворꙋ римъского ꙗким и тыи ест не нецнотою але цнотою неледаѧкою тое звали (Kartatèka, Апакр., л. 81б). Антонімамі на *цноты* маглі б быць і такія лексемы, як *безецность*, *нечестие*, *неслава* і пад., аднак прамых пацверджанняў у тэкстах пакуль не знаходзім. У некалькіх крыніцах можам сустрэць такія кантэкстуальныя антонімы, як *пыха* (Kartatèka, Дыярыуш, 164–164б; Kartatèka, Еўлаш. 139), *злосць* (Kartatèka, Варл., 122б; Kartatèka, Ев. Кал., I, 12б), *злие мысли* (Kartatèka, Еўлаш. 139); *зълые нъравы* (Kartatèka, Скар., Ж, 4б), *злой звычай* (Kartatèka, Варл., 172–172б). У некаторых тэкстах можна прасачыць апазіцыю цноты да паняцця граху, напр.: Покора абовѣмъ всѣ грѣхи очищаетъ, а пыха всѣ цнѡты выгꙋблѧетъ (Kartatèka, Ев. Кал., I, 6–6б). Мялецій Сматрыцкі ўводзіць паняцце смерць Цноты, што азначае ‘адмову ад грахоў’, і супрацьстаўляе яго жыццю пачуццяў (смыслаў) і смерці Граху: Ꙗкъ теды животомъ Смыслѡвъ живетъ той, хто грѣхови живеть, а оумираетъ справедливости: такъ смертю Цноты оумираетъ той, хто грѣхови оумираетъ, а живетъ справедливости [...] З сею Цноты см҃ртю см҃рт Грѣха жадногѡ поровнанѧ немаетъ, ꙗкъ з свѣтлостю темность (Kartatèka, Сматр., Каз., 22–23). У аналізе творчасці праваслаўных аўтараў Рэчы Паспалітай XVII ст., Аліцыя Новак паказвае гэты прыклад у шэрагу іншых і акрэслівае такі прыём як “аргумент пачуццяў” (argument zmysłowy) (гл. Nowak, 2015). Такім чынам, у глабальных катэгорыях сярэднявечнай карціны свету, цнота знаходзіцца побач з іншымі духоўнымі дабротамі, супрацьпастаўленымі таму, што дрэннае, цялеснае, пачуццёвае.

**Калакацыі**. Шмат распавесці пра старабеларускую цноту можа агляд устойлівых словазлучэнняў з падпарадкавальнай сувяззю, у склад якіх уваходзіць адпаведны выраз. Пачаць можна з тых, якія ўтрымліваюць найбольш базавыя дзеясловы *быти* і *мети*: таких и болших цнотъ будꙋчи (Kartatèka, Бібл. 77); была великое побожности и цноты (Kartatèka, Рач. л. 280); мнѡгїи въ собѣ цнѡты маетъ (Kartatèka, Ев. Кал., I, 7); иные цноты мели (Kartatèka, Бер. саб. л.55). Увогуле пераважаюць канструкцыі з дзеясловам *быць*, што адлюстроўваюць метафару аб цноце як нечым, што знаходзіцца ўнутры асобы: бы во мнѣ вѣри и цноты ку тобѣ не было (Kartatèka, Бібл. 90); всѣ в немъ найдꙋючїися побожности цноты (Kartatèka, Сматр., Каз., 43).

Шматкроць сустрэнем даследаваную лексему разам з дзеясловамі *цвичити*, а таксама *поступовати* (і аднакаранёвымі *вступовати*, *доступити*) – усе гэтыя выражэнні ілюструюць агульнае для хрысціян уяўленне пра цноту як прадмет навучання, напр.: тые которые сꙗ цвичат в цнотах, ѿ едной до дрꙋгой постꙋпꙋют (Kartatèka, Зб. 261, 82); закон҃ник҃ з малой цноты до болшое вступꙋет (Kartatèka, Зб. 261, 82). Сюды ж аднясем калакацыю з дзеясловам *наследовати*: вшелѧкихъ цнѡтъ наслѣдꙋетъ (Kartatèka, Ев. Кал., I, 2б), мѣсто цноты, злости наслѣдꙋючи

(Kartatèka, Варл., 122б); а таксама спалучэнні *научение цнот* (Kartatèka, Скар., Ж, 4б), *наука цнот* (Kartatèka, Стрыйк. 435), *приклад цнот* (Kartatèka, Руф 16 ст. 120; Kartatèka, Стрыйк. 435; Kartatèka, Бельск. 77б; Kartatèka, Лям., 1620, стар. 4).

Цноты служаць прадметам навучання і пераймання, іх можна *оказати*: цноты въ собѣ оказалесь (Kartatèka, Мак.; прадм.; л. 5б). Безумоўна, вышэйшая праява адданасці цнотам – *жити в цнотах*, *провадити живот цнот*: зацный епископъ... провадилъ живот цнот (Kartatèka, Зб. 107, 162); Чалавека, які дасягнуў поспеху ў гэтай сферы, можна ахарактарызаваць з дапамогай зваротаў: *во всѣх цнотах доскональй* (Kartatèka, Зб. 107, 172–172б, 472; 199б), *во всѣхъ цнотахъ значный* (Kartatèka, Варл. 29б); *досвядчоный в цноте* (Kartatèka, Наб. тур., 23); *чистый и ясный в цнотахъ* (Kartatèka, Алекс. 22б); *въ цнотах велце знаменитый* (Kartatèka, Варл., 136), *ѡказалыхъ цнотъ муж* (Kartatèka, Сматр., Каз., 51) і пад. Нягледзячы на варыятыўнасць канструкцый, бачым агульную граматычную мадэль – характэрна, што слова *цнота* ў адзіночным ліку ў ёй амаль не выкарыстоўваецца.

Звяртаючыся да дэрыватаў лексемы, заўважым, што прыслоўе *цнотливе* асабліва часта (5 разоў) сустракалася з дзеясловам *служити*, напр.: Трыщан служыл дворно и цнотливе, и хто его видел, кождыи сѧ дивовалъ, што ест за пане (Kartatèka, Трыст., 18). Сустракаецца яно і з дзеясловамі *заховатися*, *ховатися*, *справоватися* – пар. характэрныя спалучэнні: *цнотливое захованье* (Kartatèka, Стрыйк. 415б; Kartatèka, АГЗС, XVII, 406, 1556; Kartatèka, Арх. ЮЗР, ч. VIII, т. 4, 30, 1555; Kartatèka, АВК, XXI, 1 (1), 1555), *цнотливыи справы* (Kartatèka, Зб. 107, 117; Kartatèka, Алекс. 33б; Kartatèka, Ев. Кал. I, 32; Kartatèka, Хран., 2405; л. 98), *оучинокъ / учинки* (Kartatèka, АЗР, III, 15; Kartatèka, 1547; Kartatèka, Бяр. 60), *поступки* (Kartatèka, Зб. 82, 432б), *послуга / послуги* (Kartatèka, АВК, XX, 1543.2; Kartatèka, АВК, XXIV, 390, 1582). У святле даных дэрыватаў, цнота прадстае як каштоўнасць, якая праяўляецца ў паводзінах, справах і службе.

**Атрыбуты**. Калі даследаванае слова ўжываецца ў множным ліку, у значэнні сукупнасці станоўчых якасцяў, яго часцей за ўсё суправаджае займеннік *вшелякие*, *многие*, *все*, прыметнік *розмаитые (цноты)*. Сярод уласна атрыбутаў звяртаюць увагу адзінкавыя аўтарскія ўжыванні *высокие* (Kartatèka, Сматр., Каз., 15) і *мудрые* (Kartatèka, Троя, 8). Для словаформ у адзіночным ліку найбольш распаўсюджанай з'яўляецца характарыстыка *великая* (Kartatèka, Бер. саб., л. 10 об.; Kartatèka, Хран., 2405; л. 14; Kartatèka, Еўлаш. 139; Kartatèka, Жыц. св. 1б). У кантэксце навучання цнотам як прагрэсу маюць значэнне формы *болшая* (Kartatèka, Зб. 261, 82); *вышшая* (Kartatèka, Варл., 359б–360; 346) і *знаменитшая* (Kartatèka, Варл., 103). Адзначым таксама адзінкавыя *божая* (Kartatèka, Выкл. 3б); *святая* (Kartatèka, Зб., 752, 561); *оказалая* (Kartatèka, Сматр., Каз., 51); *несмертелная* (Kartatèka, Сматр., Каз. 6), а таксама *искушеная*: Превращеные ѵбо мысли ѿлѵчають ѿ бога, искушенаѧ же цнота наказуеть немудрыхъ (Kartatèka, Скар., П.б., л. 3б).

Услед за даследчыкамі Люблінскай школы этналінгвістыкі паспрабуем вылучыць фасеты – семантычныя катэгорыі, уласцівыя дадзенай групе лексічных адзінак. Мы мяркуем, што ў выпадку цноты, як і шматлікіх іншых назваў каштоўнасцей, рэлевантны разгляд у катэгорыях: *Суб'ект цноты*; *Умовы ўзнікнення / захавання цноты*; *Умовы страты*, а таксама *Наступствы цноты*. Мы маглі б вылучыць таксама асобную фасету *Цнота як прадмет навучання*, але не будзем разглядаць яе тут, бо дастаткова прысвяцілі ўвагі гэтаму аспекту значэння ў раздзеле пра калакацыі.

**Суб'ект цноты**. Як правіла, у тэкстах даследаванага перыяду носьбітам такой якасці, як цнота, з'яўляецца мужчына (*мужъ*). Гэта святы (у т.л. *апостолъ*) ці манах (*законникъ*, *інокъ*), але можа быць і свецкая асоба: царъ... цнотами мае ѩснѣти, абы вси ему поддани, слушне и тежъ пожиточне были рѩжени (Kartatèka, Алекс. 22б); а ведже и врядники ведля веры и цноты своее мають то правдиве... поведети... (Kartatèka, КПД, 207, 1551). Цікавыя згадкі пра народы як суб'екты цноты знаходзім у *Апісанні і абароне сабору рускага берасцейскага* (Kartatèka, Вільня, 1597): грекове иные цноты мели (Kartatèka, Бер. саб. л. 55) бо народъ нашъ в цноте надъ иные народы последнии не естъ (Kartatèka, Бер. саб., л. 50 об.). У тэксце Сматрыцкага адбываецца метанімічны перанос суб'екта цноты з памерлага Лаўрэнція Карповіча на горад, у якім ён жыў: все Вилно, которое цнотъ егѡ тыхъ полно (Kartatèka, Сматр., Каз. 37).

Толькі ў дзвюх крыніцах нашага корпуса суб'ектам цноты з'яўляецца жанчына – прычым з кантэксту не вынікае, што гаворка выключна пра сэксуальную чысціню: Барбара... была великое побожности и цноты (Kartatèka, Рач. 2); дочка Етэдѩна воеводы седмикгродског, w которои пишут кроиникарэ, иж была великое побожности и цноты (Kartatèka, Рач. 346); великаѩ еѩ цнота не толко чстости, але и терпѣнїѩ (Kartatèka, Жыц. св. 1б). Мы можам канстатаваць, што старабеларуская лексема *цнота* не выкарыстоўвалася ў згаданым значэнні актыўна. Больш верагодна, гэта роля належала лексемам *чистота*, *чистость*, напр.: если бы девка нестатечне чыстость свою на вшетеченьство оборочаючы, мешкала (Kartatèka, Ст. 1588; 8.7); ажъ до смерти чистоту свою ховали (Kartatèka, Валх., 66). Крыху часцейшае выкарыстанне з суб'ектам-жанчынай прыметніка *цнотливая* (Kartatèka, Хран., 2405, л. 195б; Kartatèka, Скар., Руф, 139; Kartatèka, АСД, 149, 1597; Kartatèka, Трыст., 38), але і там характарыстыка мае хутчэй абагулена-маральны характар.

**Умовы ўзнікнення / захавання цноты**. Крыніца цноты – у Богу (з крещениѩ ласки божее розмаитые цноты походѩт (Kartatèka, Зб., 259, 524)), пры гэтым асноўнай умовай захавання цноты, мяркуючы па старабеларускіх тэкстах, з'яўляецца пакора: покора ест жродлом цноты, пыха жродлом нецноты: нецнота в люциперꙋ, цнота в бгꙋ правдивом (Kartatèka, Дыярыуш, 173б–174); Покора абовѣмъ всѣ грѣхи очищаетъ, а пыха всѣ цнѡты выгꙋблѧетъ (Kartatèka, Ев. Кал., I, 6–6б). Вялікае значэнне мае добрая воля чалавека: каждаѩ цнота

з хꙋти ростет (Kartatèka, Зб. 261, 77б). Самаабмежаванне, у тым ліку ў словах, будзе найбольш выразнай праявай пакоры: законник, который хочет дом цноты бꙋдовати, треба абы то що прешкодою ест вперод выкинꙋл (Kartatèka, Зб. 261, 82б); молчане... ест сторожем цноты и набоженства (Kartatèka, Зб., 261, 157). Супраціўленне спакусам злых учынкаў умацоўвае цноту: Великаѧ зайсте была цнота тогѡ патрїархи иж сѧ межи злыми заховалъ при дорозѣ стой (Kartatèka, Хран., 2405; л. 14); ꙋваж иж тие сут господꙋ богꙋ милы... которые ѿ всих зрадъ и хитростей сут ѿдалены длѧ тоѓ збавител апостолом тꙋю цнотꙋ заметил мовечы будте простыми ѩко голꙋби... (Kartatèka, Зб. 255, 128–128б).

**Умовы страты цноты**. Калі пакора – асноўная ўмова захавання цноты, пыха – асноўная ўмова страты: Пыха вшелѧкое цнѡтъ богатство и справы добрыи роспорошꙋетъ, внѣвечъ оборочаетъ и затрачаетъ (Kartatèka, Ев. Кал., I, 2б). Да страты цноты вядуць таксама злосць і дрэнныя ўчынкі: Где обфитость злости и злыхъ оучинкѡвъ, тамъ недостатокъ цноты и добрыхъ справъ (Kartatèka, Ев. Кал., I, 12б). Як і несупраціўленне граху: законникъ жадный цноты не может достал который ѡбжарства не ꙋмартвает (Kartatèka, Зб. 261, 90б).

**Наступствы цноты**. Асноўнае наступства цноты, яе заканамерны вынік – гэта слава, якую належыць разумець таксама як ‘павагу, пашану’. Знаходзім мноства пацверджанняў гэтаму ўяўленню: цнотъ и покоры и доброть слава (Kartatèka, Валх. 5б); ѡныхъ цнотъ и живота Агглского слава (Kartatèka, Варл., 4б). Галоўная мэта практыкавання цноты – вечнае жыццё ў хрысціянскім разуменні: ити до домꙋ своего естъ ꙋчинков добрых цвиченем з цноты в цнотꙋ постꙋповат иж бы пришолъ до домꙋ то естъ ѿчызны небесное... (Kartatèka, Зб. 255, 208б). Пры гэтым у свецкім жыцці засведчаная цнота дае паўнамоцтвы, напр., у судовай сістэме (которыхъ (возныхъ) врѧдъ земъский и шлѧхта ѡберꙋтъ и дадꙋть сведецъство ѡ цноте и добром захованью ихъ (Kartatèka, Ст. 1588. 134 в-с)), прыхільнасць начальнікаў: y był w neho komornikom, y buduczy w komory każduiu recz cudne a radne pańskuju chował, a sprawował. A on baczeczy cnotu i dorodnoie zachowanie, uczynił ieho w sebe y marszałkom (Kartatèka, Бых. лет., 490), і ўвогуле чалавек карыстаецца большай павагай і прывілегіямі: зъ нижшого ряду посполитый человекъ приходить для своих цнотъ къ вышшой чти (Kartatèka, АЗР II, 30; 1507).

Хоць метадалогія люблінскай школы прадпісвае абапірацца на стандартныя, клішаваныя тэксты, а не арыгінальнае прыгожае пісьменства, мы не можам абмінуць увагай некаторыя яскравыя, у тым ліку аўтарскія, метафары, знойдзеныя намі ў крыніцах.

У адпаведнасці з біблійнай метафорыкай, цнота параўноўваецца са шляхам, бегам: вшелѧкихъ цнѡтъ бѣгъ выполнѧючи (Kartatèka, Ев. Кал. I, 124); з вадой: до стои егѡ дши, ѩкобы до скарбцꙋ нѣѧкогѡ всѣ Іноческїи цноты былы стеклы которыи в немъ помѣститисѧ не могши всѣм принемъ и околѡ негѡ живꙋчымъ на живый прикладъ гойне сѧ выливалы (Kartatèka, Сматр., Каз., 36–37); святлом:

фарбами цнотъ в Контерфектѣ іллꙋмїнованый (Kartatèka, Сматр., Каз., 34); домам: дом цноты бꙋдовати (Kartatèka, Зб. 261, 82б); раслінай: ѡ цнотꙋ ѥалъмꙋжны, на млс̂ти всѣхъ цнѡтъ кореню оурощенꙋю постаравшисѧ... (Kartatèka, Ст. бр., 6). Цнота – багацце і аздоба: цнѡтъ богаⷮство (Kartatèka, Ев. Кал., I, 2б), маетность цнѡтъ (Kartatèka, Ев. Кал., I, 13); до цнѡтъ, вѣчных твоих ѡздѡбъ (Kartatèka, Сматр., Каз., 14–15). Урэшце, сустракаем персаніфікацыю цноты: цноты Визерꙋнокъ честнѡ и с͠тобливе жилъ (Kartatèka, Сматр., Каз., 36); старие ѡные цнотꙋ в простой шате малевали (Kartatèka, Зб. 259, 309).

Паспрабуем даць кагнітыўную дэфініцыю даследаванаму паняццю. У старабеларускай мове цнота – гэта

а) рыса мужа, цара, манаха, святога

б) сама ў сабе рэч добрая і слаўная

в) дадзена ад Бога, спадарожнічае веры і пабожнасці, мудрасці, добрым учынкам

г) несумяшчальная з пыхай, няцнотай, злосцю

д) можа быць страчана праз пыху

е) патрабуе навучання, практыкаванняў, маўчання, пазбаўлення непатрэбнага

ж) служыць прыкладам для іншых

з) прыносіць славу і сацыяльны рост таму, хто яе мае,

і) з’яўляецца аздобай чалавека

к) неабходная чалавеку.

Вымалёўваецца ўяўленне пра каштоўнасць, якое інтуітыўна можна аднесці да адпаведных слоў розных моў сярэднявечча, у цэлым згоднае з нашымі ведамі пра хрысціянскае і філасофскае паняцце цноты. Ці ёсць у ім нешта культурнаспецыфічнае? Паспрабуем зразумець гэта праз параўнанне з польскім матэрыялам.

Частотнасць польскай лексемы непараўнальна большая: 3528 – і гэта перавага не толькі ў абсалютных лічбах. Пра актуальнасць паняцця і высокі ўзровень яго асэнсавання сведчыць таксама вялікая колькасць дэрыватаў і аднакаранёвых слоў: апроч назоўніка *cnota* ёсць яшчэ дзве сінанімічныя лексемы *cność* і *cnotność*; памяншальна-ласкальнае *cnotka*, прыметнікі *cny* і *cnotliwy*, прыслоўі *cnie* і *cnotliwie*, гняздо *zacny*, *zacnie*, *zacność*. Ад таго ж кораня шэраг антонімаў: *niecnota, niecność, bezcnocie, bezecność, bezeceństwo*.

Шмат падабенстваў бачым пры разглядзе калекцый са словам *cnota* і назвамі іншых каштоўнасцей (напр., *wiara, bojaźń boża, pobożność, świątobliwość, wierność, mądrość, pokora, sumienie, nauka, sprawa, dzielność, obyczaje, zachowanie, powinność* і інш.). Сувязь паміж цнотай і славай падаецца яшчэ больш выразнай, што адбілася ў дастаткова частотных спалучэннях *cnota, (a, i, albo) sława*; *cnota z sławą*; таксама сустракаецца семантычна рэлевантнае для старабеларускай карціны свету спалучэнне *cnota i (a) żywot*. Звяртаюць на сябе ўвагу нетыповыя для старабеларускага матэрыялу калекцыі са словамі *rozum; godność; poczciwość;*

*męstwo; dobroć / dobrota; stałość; dowcip* (SPXVI, 3, s. 540–545). З аднаго боку, у іх прасочваецца больш трывалая сувязь паняцця cnota з уяўленнямі пра гонар і годнасць. З іншага боку, ужыванне назоўніка *cnota* не ў якасці гіпероніма, а ў якасці кагіпоніма ці блізказначнага слова з назвамі больш канкрэтных якасцей сведчыць пра самастойнасць гэтага канцэпта ў моўнай карціне свету тагачасных палякаў.

Падабенствы ёсць у атрыбутах: найбольш частотны прыметнік *wielka*, сярод іншых – *okazała, doskonała, wysoka, dobra, poczciwa, miła, nadobna, ozdobiona* і інш. Сустракаецца акрэсленне *rozmaita (rozmaite)*. У цэлым шэраг атрыбутаў даўжэйшы, чым у беларускай мове, але не мае істотных канцэптуальных адрозненняў.

Вельмі багата прадстаўлены свабодныя і ўстойлівыя словазлучэнні з падпарадкавальнай сувяззю. Не маючы месца на падрабязны аналіз, прывядзем толькі найбольш частотныя. Перш за ўсё гэта калакацыі, звязаныя з ідэяй навучання цнотам, наследавання папярэднікаў і развіцця на гэтым шляху, у т.л. са словамі *postępować (postępek, postępowanie, postępujący), naśladować (naśladowanie, naśladownik), ćwiczyć, pomnażać się (mnożyć się, pomnożenie, pomnożony, rozmnażać (się), rozmnożyć)*, а таксама *ku cnocie pobudzać, prowadzić, przychodzić, wieść* і пад., *trwać, zachowywać* і пад. (SPXVI, 3, s. 543, 539). Вельмі яскрава праяўляецца метафара цноты як ‘аздобы’: высокую частотнасць маюць калакацыі з лексемамі *ozdobić się, ozdobny, (nie) ozdobiony, okraszony (okrasić)* (SPXVI, 3, s. 543, 539). Бачым знаёмую канструкцыю *doskonały w cnocie*, а ў польскай мове XVII ст. знаходзім таксама знаёмую нам метафару *dom cnoty* (EKTP XVII–XVIII) – і ў цэлым можам канстатаваць вялікае падабенства ў канцэптуалізацыяй беларускага і польскага паняццяў.

Беата Рашэўска-Журэк звяртае ўвагу на тое, што ўжо ў XVI ст. відавочна выразная дыферэнцыяцыя суб’ектаў цноты: “...królewskie, rycerskie, szlacheckie” (Raszewska-Żurek, 2012, s. 116). Суб’ектам каштоўнасці можа з’яўляцца таксама народ, краіна: *O mężna Polska cnoto / toć u ciebie nic podlejszego nád śmierć nie jest* (SPXVI, цыт. паводле Raszewska-Żurek, 2012, s. 117).

Значэнне лексемы *cnota*, звязанае з жаночай сэксуальнай нявіннасцю, узнікае ў польскай мове, хутчэй за ўсё, менавіта ў гэтым стагоддзі і знаходзіць мноства рэпрэзентацый у тэкстах, у прыватнасці, у калакацыях *cnoty bronić, przestrzegać, strzec, cnotę stracić, zruszyć, trwać w cnocie* (SPXVI, цыт. паводле Raszewska-Żurek, 2012, s. 117). І хоць шмат у якіх кантэкстах нельга аддзяліць гэты аспект ад магчымай згадкі цноты як больш універсальнай маральнай каштоўнасці, умова страты дзявочай цноты ў першую чаргу звязана з сэксуальнай сферай. У артыкуле, прысвечаным гісторыі паняцця жаночай цноты ў польскай мове, Б. Рашэўска-Журэк канстатуе факт, што ролі мужчын і жанчын у грамадстве былі прынцыпова рознымі, таму: “Pośród precyzyjnieszych pojęć – składników cnoty, jak roztropność, umiar, dzielność, godność, mądrość, zacność, sprawiedliwość i inne, większość dotyczyła mężczyzn” (Raszewska-Żurek, 2011, s. 85).

Калі вярнуцца да ўмоў захавання цноты, у цэлым яны падобныя да тых, якія засведчаны ў старабеларускай мове. Звернем увагу хіба што на залежнасць цноты ад розуму: *A kto niema rozumu tedy tákowy niema cnoty i mocy duchownej* (SPXVI, цыт. паводле Raszewska-Żurek, 2012, s. 116). Рашэўска-Журэк падкрэслівае, што *cnota* – абавязковая, патрэбная рыса: гл. выказванне Мікалая Рэя: *Bez cnoty człowiek źwirzę* (SPXVI, цыт. паводле Raszewska-Żurek, 2012, s. 117); у польскай мове XVI ст. спалучэнне *cnota i powinność* зарэгістравана ў 11 кантэкстах (SPXVI, 3, 541).

Галоўнае наступства цноты, як і ў старабеларускай мове, слава: *Cnota nadal na sławę zasługuje i sławy przysparza* (SPXVI, цыт. паводле Raszewska--Żurek, 2012, s. 117). Але, як і ў старабеларускай, у польскай мове XVI ст. падкрэсліваецца залежнасць цноты ад сціпласці, што адзначаецца, сярод іншага, у аўтарскай метафары Мікалая Рэя: *A wszakoż miła cnota / y w sukience szarey* (SXVI, 3, s. 542). Увогуле ў польскай мове гэтага перыяду надзвычай шмат персаніфікацый цноты, прыклады знаходзяцца і ў тэкстах XVII і XVIII стст.: *Cnota jest panią świata; Cnota nigdy nie umiera* (Raszewska-Żurek, 2012, s. 118).

Непараўнальным застаецца створаны Мялеціем Сматрыцкім вобраз “смерці Цноты”. Ні ў польскай мове XVI ст., ні ў пазнейшы перыяд не знаходзім адпаведнікаў беларускім калекцыям *цноты и дары духа светого*; *вера, цнота и охота*. Аднак, як мы паказалі раней, часцей можна сцвярджаць пра адсутнасць той ці іншай семантычнай залежнасці ў старабеларускіх тэкстах: амаль адсутнічае рэпрэзентацыя значэння ‘жаночай сэксуальнай чысціні’; выяўляецца меншая сувязь цноты з паняццямі гонару і годнасці. Безумоўна, усе выяўленыя адрозненні амаль не істотныя на фоне пераканаўчых сведчанняў падабенства даследаваных паняццяў.

## Спіс скарачэнняў, прынятых у *Гістарычным слоўніку беларускай мовы*

АВК – *Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией для разбора древних актов* (1885–1915, Т. I, III, XXXIV). Вильна.

АЗР – *Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные археографической комиссией* (1848, Т. II). Санкт-Петербург.

Алекс. – *Александрыя* (пачатак XVII ст.) [Рукапіс]. Российская национальная библиотека, F. XVII, 5, Л. 1–45б.

Апакр. – *Апокрисисъ албо отповедь на книжкы о съборе берестейскомъ* (1598). Вильня.

Арх.зб. – *Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси* (1867–1890, Т. II, с. 19). Вильна.

Арх. ЮЗР – *Архив Юго-Западной России, издаваемый временной комиссией для разбора древних актов* (1859–1911, Ч. I–VIII). Киев.

АСД – *Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси* (1867–1890, Т. I–XI). Вильна.

Атыла – *Гісторыя аб Атыле* (каля 1580 г.). *Сборник Отделения русского языка и словесности*, 44(3), 173–235.

Бельск. – *Летаписецъ то естъ кроиника... («Хроника» М. Бельскага)* (пачатак XVII ст.) [Рукапіс]. Российская национальная библиотека, F. IV. 688.

Бер.саб. – *Описание и оборона събору руского берестейского* (1597). Вильня.

Біблія – *Біблейскія кнігі* (пачатак XVII ст.) [Рукапіс]. Российская национальная библиотека, F. I. 2.

Бых. – *Летапіс па спісе Быхаўца* (канец XVI – пачатак XVII ст.). *ПСРЛ*, Т. XVII. Санкт-Петербург, 1907.

Бяр. – *Лексиконъ славенороссkій именъ толъкованіе...* (1653). Куцеин.

Валх. – *Аповесць аб трох каралях-валхвах* (канец XV ст.) [Рукапіс]. Российская национальная библиотека, Q. I. 391, л. 39–96б.

Варл. – *Гисторія албо правдивое выписаніе ст. Іоанна Дамаскина...* (1637). Куцеин.

Выкл. – *Выклад тлумачэнняў біблейскіх кніг* (сярэдзіна XVII ст.) [Рукапіс]. Національна бібліотека України імені В. І. Вернадського, 9п/111.

ГЮМ – *Историко-юридические материалы, извлеченные из архивных книг губерний Витебской и Могилевской* (1871–1906, Вып. XXI, с. 448). Витебск.

Дыяр. – *Діаріушъ албо список деевъ правдивых...* (1638–1648) [Рукапіс]. Государственный исторический музей (Москва), Синод. 856.

Ев. Кал. – *Евангеліе учителное, албо казаня на кождую неделю и свята урочистыи презъ святого отца нашего Калиста* (1616). Еўе.

Еўл. – *«Дзённік» Ф. Еўлашоўскага* (пачатак XVII ст.) [Рукапіс]. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie.

Жыц. св. – *Зборнік жыцій святых* (сярэдзіна XVII ст.) [Рукапіс]. Российская государственная библиотека, № 159.

Зб. 107 – *Зборнік павучальных навел рэлігійнага зместу* (сярэдзіна XVII ст.) [Рукапіс]. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, RKF-107.

Зб. 255 – *Зборнік павучэнняў* (сярэдзіна XVII ст.) [Рукапіс]. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, RKF-255.

Зб. 259 – *Зборнік павучэнняў* (сярэдзіна XVII ст.) [Рукапіс]. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, RKF-259.

Зб. 261 – *Зборнік павучэнняў* (пачатак XVII ст.) [Рукапіс]. Lietuvos mokslų akademijos Vrublevskių biblioteka, RKF-261.

Зб. 752 – *Зборнік жыцій святых* (другая палавіна XVII ст.) [Рукапіс]. Государственный исторический музей (Москва), Синод. 752.

Зб. вып. – *Собраніе припадковъ краткое и духовнымъ особамъ потребное* (1722). Супрасль.

Зіз. – *«Лексисъ» Л. Зізанія* (1596). Вильня.

КВС – *Кніга Віленскага замкавага суда* (1552) [Рукапіс]. Российский государственный архив древних актов, Ф. 389, Кн. 240.

КПД – *Литовская метрика. Книги публичных дел. Русская историческая библиотека* (1914, Т. XXX). Юрьев.

Лям. – *Ляментъ у света оубогихъ* (1620). Вильня.

Мак. – *Духовныи беседы святого отца нашего Макарія, пустелника египетского...* (1627). Вильня.

Наб. тур. – *О набоженстве турецкомъ* (канец XVI ст.) [Рукапіс]. Государственный исторический музей (Москва), Синод. 790, л. 20–24б.

Пыт. – *Вопросы и ответы православному зъ папежником* (1603). *Русская историческая библиотека*, Т. VII. Санкт-Петербург, 1882.

Рач. – *Летапіс па спісе Рачынскіх* (каля 1580 г.). *ПСРЛ*, Т. XVII, с. 297–355. Санкт-Петербург, 1907.

Скар., Ж. – *«Библия руска» выдання Ф. Скарыны: Кніга Быцця* (1519). Прага.

Скар., П.б. – *«Библия руска» выдання Ф. Скарыны: Кніга прамудрасці божай* (1518). Прага.

Скар., Руф – *«Библия руска» выдання Ф. Скарыны: Кніга Руф* (1518). Прага.

Сматр. – *Казанье на честныи погребъ пречестного и превелебного мужа господина и отца Леонтія Карповіча... презъ Мелетія Смотриского* (1620). Вильня.

Ст. 1588 – *Статут Вялікага княства Літоўскага* (1588). Вильня.

Ст. бр. – *Статут полацкага брацтва* (1651) [Рукапіс]. Національна бібліотека України імені В. І. Вернадського, 542 п/1749.

Стрыйк. – *Кроиника словяновъ руская... («Хроніка» М. Стрыйкоўскага)* (пачатак XVII ст.) [Рукапіс]. Российская национальная библиотека, F. IV. 688.

Трыст. – *Аповесць аб Трыстане* (каля 1580 г.). *Сборник Отделения русского языка и словесности*, 44(3), 1–127. Санкт-Петербург, 1888.

Троя – *Аповесць аб Трої* (пачатак XVI ст.) [Рукапіс]. Національна бібліотека України імені В. І. Вернадського, ДА/п 157.

Хр. польск. – *«Короткое описанье кройники полской»* (пачатак XVII ст.) [Рукапіс]. Российская национальная библиотека, F. IV. 152.

Хран. – *Книга, глаголемая кроникъ, сиречъ собраніе от многихъ летописецъ («Хранограф»)* (XVII ст.) [Рукапіс]. Российская государственная библиотека, № 2405.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

### Sources / Źródła

Kartatèka *Hìstaryčnaha sloŭnika belaruskaj movy* (Addzel historyì belaruskaj movy filìjala Ìnstytuta movaznaŭstva ìmja Jakuba Kolasa Cèntra dasledavannjaŭ belaruskaj kul′tury, movy ì lìtaratury NAN RB). [Картатэка *Гістарычнага слоўніка беларускай мовы* (Аддзел гісторыі беларускай мовы філіяла Інстытуту мовазнаўства імя Якуба Коласа Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН РБ)].

### Studies / Opracowania

Ajdačić, Dejan. (2018). „Kolekcje wartości" i ich profilowanie. W: *SlovoSlavia. Studia z etnolingwistyki słowiańskiej* (s. 109–119). Łódź: Wydawnictwo Uniwersytetu Łódzkiego.

Bartmiński, Jerzy. (1988). Definicja kognitywna jako narzędzie opisu konotacji słowa. W: Jerzy Bartmiński (red.), *Konotacja* (s. 169–183). Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Bartmiński, Jerzy. (1990). Punkt widzenia, perspektywa interpretacyjna, językowy obraz świata. W: Jerzy Bartmiński (red.), *Językowy obraz świata* (s. 109–127). Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Bartmiński, Jerzy. (2006). *Językowe podstawy obrazu świata*. Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Buczyńska-Garewicz, Hanna. (1981). O pojęciu cnoty: czy cnota jest przeżytkiem? *Teksty: teoria literatury, krytyka, interpretacja*, 1 (55), s. 9–30.

Bulyka, Aljaksandr. (1980). *Lèksìčnyja zapazyčannì ŭ belaruskaj move XIV–XVIII stst.* Minsk: Navuka ì tèhnìka. [Булыка, Аляксандр. (1980). *Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV–XVIII стст.* Мінск: Навука і тэхніка].

Bulyka, Aljaksandr. (2005). *Sloŭnik inšamoŭnyh sloŭ. Aktual'naja lèksìka*. Minsk: Belaruskaja èncyklapèdyja ìmja Petrusja Broŭki [Булыка, Аляксандр. (2005). *Слоўнік іншамоўных слоў. Актуальная лексіка.* Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі]. Pobrano z: https://verbum.by/sis2005 [dostęp: 25.05.2025].

Chaustowicz, Maryla. (2024). Starobiałoruska Opowieść o Trzech Królach. *Acta Albaruthenica*, 24, s. 379–387 [Хаўстовіч, Марыля. (2024). Старабеларуская аповесць пра Трох Каралёў. *Acta Albaruthenica*, 24, с. 379–387].

EKTP XVII–XVIII. (2025). *Elektroniczny korpus tekstów polskich z XVII i XVIII*. Kraków: Instytut Języka Polskiego PAN. Pobrano z: https://korba.edu.pl (dostęp: 03.06.2025).

Gryshkova, Nina. (2014). Leksem, pojęcie, stereotyp, koncept, znaczenie, idea – propozycja regulacji terminologicznych. W: Iwona Bielińska-Gardziel, Stanisława Niebrzegowska-Bartmińska, Joanna Szadura (red.), *Wartości w językowo-kulturowym obrazie świata Słowian i ich sąsiadów*, t. 3: *Problemy eksplikowania i profilowania pojęć* (s. 21–49). Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Grzeszczak, Monika. (2017). Honor w języku polskim. W: Petko Sotirov, Dragan Ajdačić (red.), *Leksykon aksjologiczny Słowian i ich sąsiadów*, t. 5: *Honor* (s. 115–148). Lublin: Wydawnictwo UMCS.

HSBM 20 – *Hìstaryčny sloŭnik belaruskaj movy* (t. 20). (2000). Minsk: Belaruskaja navuka. [*Гістарычны слоўнік беларускай мовы* (т. 20). (2000). Мінск: Беларуская навука.]

HSBM 36 – *Hìstaryčny sloŭnik belaruskaj movy* (t. 36). (2014). Minsk: Belaruskaja navuka. [*Гістарычны слоўнік беларускай мовы* (т. 36). (2014). Мінск: Беларуская навука.]

Korus, Kazimierz. (2017). TIMÉ (godność, honor) w starożytnej kulturze greckiej. W: Petko Sotirov, Dragan Ajdačić (red.), *Leksykon aksjologiczny Słowian i ich sąsiadów*, t. 5: *Honor* (s. 27–50). Lublin: Wydawnictwo UMCS.

LASiS – Bartmiński, Jerzy (red.). (2015–2024). *Leksykon aksjologiczny Słowian i ich sąsiadów*, (t. 1: *Dom*, t. 2: *Europa*, t. 3: *Praca*, t. 4: *Wolność*, t. 5: *Honor*, t. 7: *Demokracja*). Lublin–Warszawa: Wydawnictwo UMCS; Instytut Slawistyki PAN; Fundacja Slawistyczna.

Niebrzegowska-Bartmińska, Stanisława. (2020). *Definiowanie i profilowanie pojęć w (etno) lingwistyce*. Lublin: Wydawnictwo UMCS.

Nowak, Alicja. (2015). Argument „zmysłowy" w siedemnastowiecznych prawosławnych kazaniach w Rzeczypospolitej. *Slavica Wratislaviensia*, 156, s. 125–135.

Raszewska-Żurek, Beata. (2011). Kobieca cnota. Próba zrozumienia ewolucji znaczenia *cnoty* na przestrzeni wieków. *Studia z Filologii Polskiej i Słowiańskiej*, 46, s. 83–102.

Raszewska-Żurek, Beata. (2012). Leksem *cnota* i leksemy pokrewne w języku polskim w ciągu wieków. *Język Polski*, 92 (2), s. 113–125.

SEBor – Boryś, Wiesław. (2008). *Słownik etymologiczny języka polskiego*. Kraków: Wydawnictwo Literackie.

SEBr – Brückner, Aleksander. (1927). *Słownik etymologiczny języka polskiego*. Kraków: Krakowska Spółka Wydawnicza.

SESł – Sławski, Franciszek. (1952–1956). *Słownik etymologiczny języka polskiego*, t. 1. Kraków: Towarzystwo Miłośników Języka Polskiego.

SPsł – Sławski, Franciszek (red.). (1976). *Słownik prasłowiański*, t. 2. Wrocław: Ossolineum.

SPXVI – *Słownik polszczyzny XVI wieku*, t. 3: *C–Ch*. (1968). Warszawa: Instytut Badań Literackich PAN, Państwowe Wydawnictwo Naukowe.

SStp – *Słownik staropolski*, t. 1 (red. S. Urbańczyk). (1953). Wrocław: Ossolineum, Wydawnictwo PAN.

SSSL – Bartmiński, Jerzy (red.). (1996). *Słownik stereotypów i symboli ludowych*, t. 1: *Kosmos*, cz. 1: *Niebo, światła niebieskie, ogień, kamienie*. Lublin: Wydawnictwo UMCS.

TSBLM – Kapyloŭ, Ì. L. (rèd.). (2002). *Tlumačal'ny sloŭnik belaruskaj lìtaraturnaj movy. Minsk: Belaruskaja Èncyklapèdyja ìmja Petrusja Broŭki.* [Капылоў, І. Л. (red.). (2002). *Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы*. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі.]. Pobrano z: https://verbum.by/tsblm (dostęp: 25.05.2025).

TSBM – *Tlumačal'ny sloŭnik belaruskaj* movy, t. 1–5, *(1977–1984).* Minsk: Belaruskaja Èncyklapèdyja ìmja Petrusja Broŭki. [*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*, t. 1–5, *(1977–1984)*. Мінск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі]. Pobrano z: https://verbum.by/tsbm (dostęp: 25.05.2025).

SUBMITTED: 2025.06.04
ACCEPTED: 2025.10.27
PUBLISHED ONLINE: 2026.01.30

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Nadzeya Kakhnovich / Надзея Кахновіч** – Polska; Warszawa; Uniwersytet Warszawski, Katedra Białorutenistyki; doktorantka; *specjalność*: językoznawstwo; *zainteresowania naukowe*: języki słowiańskie, etnolingwistyka.

*Adres*: ul. Dobra 55, 00-312 Warszawa, Polska

*Wybrane publikacje:*

1. Кахновіч, Надзея. (2015). Праблема вызначэння ядзернай лексемы для ЛСП «гонар» у беларускай мове (дыяхранічны аспект). В: *Языковой контакт: сб. науч. ст.* (с. 83–95). Минск: РИВШ.
2. Кохнович, Надежда. (2017). Концепт ГОНАР в представлении белорусских студентов. W: Iwona Bielińska-Gardziel, Małgorzata Brzozowska, Beata Żywicka (red.), *Nazwy wartości w językach europejskich. Raport z badań empirycznych* (s. 309–323). Przemyśl: Państwowa Wyższa Szkoła Wschodnioeuropejska.
3. Кохнович, Надежда. (2017). Концепт ГОНАР в современном белорусском языке. W: Jan Bartmiński (ред.), *Leksykon aksjologiczny Słowian i ich* sąsiadów, t. 5: *Honor* (s. 237–272). Lublin: Wydawnictwo UMCS.
4. Кохнович, Надежда. (2019). Отражение в языке Статута ВКЛ 1588 г. представлений белорусской шляхты о чести и достоинстве. *Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология*, 4(101), с. 118–125.
5. Кахновіч, Надзея. (2019). Семантыка і сінтагматыка лексем *честь*, *почтивость*, *учтивость* у старабеларускай мове на фоне польскай мовы XVI ст. *Вестник МГЛУ. Серия 1. Филология*, 5(102), с. 105–111.